ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ЛІПЕНЬ

Віцебск 2013

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ліпень

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

карпаратыўны фестываль. Адкрыццём фестывалю сталі зноў створаныя ВІА «Кіраўскі мост», фальклорны калектыў «Раніца», многія дэбютныя выступленні індывідуальных выканаўцаў. Галоўны прыз застаўся ў Аршанскім філіяле.

http://www.beltiz.com/index.php?option

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Ліпень

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2013

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : ліпень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. — Віцебск, 2013. — 25 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2013

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

У рэпертуары Нацыянальнага тэатра імя Я. Коласа з'явіўся новы спектакль – «Кошкі-мышкі». Аўтар п'есы – украінскі драматург *А. Мардань* – абазначыў яе жанр як скандал без антракта, а рэжысёр-пастаноўшчык *Ю. Лізінгевіч* убачыў у драматургіі сямейны псіхалагічны дэтэктыў. У спектаклі заняты *Т. Кабяк*, заслужаная артыстка Беларусі *Т. Ліхачова*, *Ю. Крашэўская*.

Витебские вести. — 2013. — 1 авг. — С. 23.

МАТЭРЫЯЛЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК

21 мая ў Мінску адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне лаўрэатаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Сярод удзельнікаў цырымоніі была і прадстаўніца Віцебска – *Анастасія Васільева* (педагог Т. Кірылава), салістка ўзорнай студыі эстраднай песні «Форум» ДУ «Цэнтр культуры "Віцебск"».

http://www.gck.by/2013/06/5217/

12 чэрвеня ў Інстытуце філалогіі Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі пры падтрымцы пасольства Беларусі на Украіне адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае прысваенню Цэнтру беларускай мовы і культуры імя У. Караткевіча.

Аршанская газета. — 2013. — 18 ліп. — С. 2.

З **12** па **16 чэрвеня** ў Маскве прайшоў фестываль-рэканструкцыя гарадскога свята пачатку XX стагоддзя пад назвай «Шчаслівы трынаццаты». Артысты моладзёжнага тэатра «Колесо» (кіраўнік В. Цвікі) ГЦК «Віцебск» паказалі масквічам музычны фарс «ForteПроУН», што расшыфроўваецца як «громкий проект утверждения нового», па творах дэ Гельдерода, Бранта, Малевіча, Хармса.

http://www.gck.by/2013/06/5217/

30 чэрвеня на сцэне культурна-рэабілітацыйнага цэнтра прыватнага прадпрыемства «Элект» ГА «БелТІЗ» Аршанскага філіяла заквітнела «Радуга». Менавіта так называўся першы адкрыты абласны

У галерэі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Панарама» прайшла выстаўка работ полацкага мастака *А. Паўлыгі* (пейзаж).

Полацкі веснік. — 2013. — 19 ліп. — С. 15.

«Только вечные ценности» – так назвалі мастакі *Тацяна* і *Юрый Рудэнка* сваю выстаўку, якая адкрылася ў **ліпені** ў Мастацкім музеі Віцебска. У дзвюх экспазіцыйных залах прадстаўлены 164 творы мастацтва, выкананыя ў розных жанрах і аўтарскіх тэхніках (жывапіс, батык, габелен, вышыўка, ювелірная пластыка).

Витебские вести. — 2013. — 20 июля. — С. 10.

Фотавыстаўка «Витебск древний, православный», прысвечаная 1025-годдзю Хрышчэння Русі, адкрылася ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі. Аўтар работ – пратаіерэй *Аляксандр Захараў*.

Витебские вести. — 2013. — 1 авг. — С. 16.

КІНАМАСТАЦТВА

19 ліпеня ў кінатэатры «Мир» з аншлагам адбылася прэм'ера блокбастара «Война миров Z» у 3D фармаце. У кінатэатры ўстаноўлены лічбавы кінапраектар «Christie CP220» з 3D сістэмай Dolby.

Витебские вести. — 2013. — 25 июля. — С. 4.

МУЗЫКА

20 ліпеня на Замкавай гары ў Браславе адбыўся першы ў гісторыі горада вялікі **рок-фэст «Жывое неба Браслава»**. Фестываль прайшоў пры падтрымцы Браслаўскага райвыканкама. У ім ўдзельнічалі кавер-праект «The Labbuhi» (г. Браслаў), рок-гурт «Ветэран Grader» (г. Наваполацк), кавер-група «Скіфы» (г. Паставы), рок-гурт «Версія» (г. Наваполацк), гурт «Супрун Бэнд» (г. Наваполацк), кавер-група «Лейсвер» (г. Браслаў). Гасцямі фестывалю сталі аўтар-выканаўца *Святлана Трапук* (г. Наваполацк) з групы «Perfect Life», рок-гурт «Fake Lab» (г. Мінск), рок-гурт «The Brooklet» (г. Мінск), гурт «The back to the future» (г. Наваполацк).

Витебские вести. — 2013. — 27 июля. — С. 8.

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА…….4

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……..5

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 ліпеня 2013 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя аддзелам культуры Міёрскага райвыканкама, Браслаўскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Полацкай і Шаркаўшчынскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

У музеі Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова экспанавалася выстаўка работ удзельнікаў маладзёжнага пленэра «Віцебшчына партызанская». У экспазіцыі былі прадстаўлены некалькі дзясяткаў работ, аўтарамі якіх з’яўляюцца студэнты і выкладчыкі мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава.

Витебские вести. — 2013. — 2 ліп.. — С. 2.

У Аршанскім этнаграфічным музеі «Млын» працавала выстаўка прадукцыі Аршанскай фабрыкі мастацкіх вырабаў «Узоры спадчыны».

Аршанская газета. — 2013. — 13 ліп. — С. 6.

У г. Сянно адкрыты помнік воінам-афганцам, усім сенненцам, якія прымалі ўдзел у войнах за межамі краіны. У парку трох герояў на пастаменце ўстаноўлены бронетранспарцёр, такая ж легендарная машына, як і танк Т-34. Адкрыццё помніка адбылося **25 чэрвеня**, у дзень вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Голас Сенненшчыны. — 2013. — 2 ліп. — С. 1, 4.

Памятны знак Герою Савецкага Саюза *Георгію Грыгор’еву* ўстаноўлены на воінскім мемарыяле імя Ленінскага камсамола ў аграгарадку Копці Віцебскага раёна. Ураджэнец Маскоўскай вобласці, разведчык загінуў пад Віцебскам ў студзені 1944 года. Гвардыі сяржант быў адным з тых савецкіх воінаў, якія паўтарылі подзвіг Аляксандара Матросава.

Голас Сенненшчыны. — 2013. — 9 ліп. — С. 2.

МАСТАЦТВА

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У аршанскім Музеі Уладзіміра Караткевіча ў **ліпені** працавала першая дабрачынная выстаўка. Зладзіў яе знакаміты Мікола Купава. Мэтай мастака і ўсіх неабыякавых аршанцаў стаў збор сродкаў на дапамогу ў рэстаўрацыі Базыльянскага кляштара.

http://www.kimpress.by/

«Бібліятэчная лаўка» з выстаўкай-віктарынай «Займальная класіка». Бібліятэкарамі аддзела абслугоўвання была арганізавана кніжная выстаўка «Інтэлектуальнае чытанне», на якой былі прадстаўлены кнігі сучаснай і класічнай мастацкай літаратуры айчынных і замежных пісьменнікаў. На працягу ўсяго свята на пляцоўцы ля памятнага знака літары «Ў» гучалі вершы і песні полацкіх паэтаў, членаў літаратурных аб'яднанняў горада «Полоцкая ветвь», «Наддзвінне» і «Літаратурны каўчэг». Упрыгожваннем свята стала музычнае суправаджэнне народнага ансамбля беларускай песні і музыкі «Полацкія россыпы». Сюрпрызам для жыхароў і гасцей горада стала акцыя «Кніга ў падарунак». У шырокім асартыменце на мерапрыемстве была прадстаўлена выдавецкая прадукцыя бібліятэк: буклеты, сцікеры, закладкі. Своеасаблівым вынікам бібліятэчнага праекта стаў флэшмоб «Бібліятэка – старт паспяховых пачынанняў!».

22 ліпеня Прававая гульня «Маленькі прававед» для наведвальнікаў школьнага лагера СШ № 16 *(бібліятэка-філіял № 8)*.

Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк

У бібліятэках сістэмы да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь былі афармлены кніжныя выстаўкі «Непаўторная, адзіная, мая Радзіма – Беларусь» *(Лонская сельская бібліятэка)*, «Беларусь мая, родны край» *(Вялікасельская сельская бібліятэка)*, «Радзімы лірычны партрэт» *(цэнтральная раённая бібліятэка)* і інш.

3 ліпеня Гадзіна мужнасці «Славім вялікі подзвіг» *(Навасёлкаўская сельская бібліятэка)*.

25 ліпеня Гадзіна духоўнасці «Крещение Руси» *(цэнтральная раённая бібліятэка)*. У *Каўшэлеўскай* і *Германавіцкай сельскіх бібліятэках* працавалі кніжныя выстаўкі «Современный мир православия». Супрацоўнікі *дзіцячай бібліятэкі* правялі з юнымі чытачамі гутарку пра жыццё і дзейнасць святога Канстанціна Жданава.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь** у Віцебску пачаліся ўрачыстым ускладаннем вянкоў і кветак да Вечнага агню, затым прайшоў мітынг, тэатралізаванае прадстаўленне на плошчы Перамогі і канцэрт творчых калектываў устаноў культуры і адукацыі Віцебска. На плошчы Перамогі адбыўся святочны канцэрт з удзелам народнага артыста Расіі *Рэната Ібрагімава* і групы «Дискомафия», які завяршыўся акцыяй «Спяваем гімн разам» і святочным феерверкам.

Паўсюдна ў вобласці прайшлі ўрачыстыя мітынгі, святочныя канцэрты мастацкай самадзейнасці, кірмашы, выстаўкі, гульні, спартыўныя спаборніцтвы і іншыя мерапрыемствы.

7 ліпеня ў 54 раз на Кургане Дружбы, што месціцца на мяжы трох дзяржаў – Беларусі, Расіі і Латвіі, прайшла сустрэча людзей, дзякуючы якім сённяшняе пакаленне ведае пра Вялікую Айчынную вайну толькі па фільмах, кнігах, расповедах. Каля 400 ветэранаў вайны гасцінна прымаў у гэтым годзе расійскі бок. На тэрыторыі Себежскага раёна Пскоўскай вобласці адбыўся ўрачысты мінынг. Працягнуў сустрэчу канцэрт заслужанай артысткі Расіі *Марыны Курчававай* і харэаграфічнага ансамбля «Русские узоры», адбылася дэманстрацыя дакументальных фільмаў пра гісторую сустрэч на Кургане і жыццё партызанскага краю ў гады вайны.

Витебские вести. — 2013. — 9 ліп. — С. 1.

Полацкі веснік. — 2013. — 19 ліп. — С. 3.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

У рамках праекта трансгранічнага супрацоўніцтва «Содействие развитию туризма в приграничных районах Латгалии, Утяны и Витебска» (Bella Dvina 2) **6 ліпеня** ў г. Браславе прайшоў конкурс самадзейнасці маладых выканаўцаў эстраднай песні «Белла Мелодия-2013», Гран-пры якога заваявала браслаўчанка *Алена Карпацій*.

Полацкі веснік. — 2013. — 19 ліп. — С. 2.

Народны тэатр Докшыцкага дома культуры **11 ліпеня** прыняў удзел у Міжнародным фестывалі класічнай драматургіі аматарскіх тэатраў «Вішнёвы сад» у г. Балві (Латвія). Артысты паказалі спектакль па п'есе Федэрыка Гарсія Лоркі «Страсці па Адэлі» ў пастаноўцы мясцовага рэжысёра *Ганны Яцкоўскай*.

Витебские вести. — 2013. — 25 июля. — С. 15.

З перамогай вярнулася ўзорная студыя «Альтанка» з XXXX Міжнароднага фестывалю дзіцячай культуры «Кельце-2013», які праходзіў у Польшчы з **14** па **28 ліпеня**. У конкурснай праграме свята прымалі ўдзел юныя артысты з Польшчы, Украіны, Літвы, Расіі, Беларусі, Македоніі і іншых краін. Вакальная група «Альтанкі» ў намінацыі «Вакал. Эстрадны ансамбль» (узроставая катэгорыя ад 13 да 16 гадоў) заняла першае месца.

Витьбичи=Віцьбічы. — 2013. — 27 июля. — С. 13.

25–28 ліпеня працаваў XXII Міжнародны маладзёжны лагер «Бе-La-Русь», які адбыўся на тэрыторыі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ля Кургана Дружбы на стыку межаў Беларусі, Латвіі і Расіі. Маладыя людзі змагаліся ў розных творчых і спартыўных конкурсах: бівуакаў, маладзёжных ініцыятыў «100 идей для Бе-La-Руси», творчым фестывалі «Бе-La-Русские зори», «Лучшая пара Бе-La-Руси». У праграму таксама былі ўключаны спартыўныя спаборніцтвы па футболе, валейболе, армрэслінгу і інш. На форуме працаваў горад майстроў «Бе-La-Русские забавы», папулярызаваліся нацыянальныя народныя гульні і танцы.

Витебские вести. — 2013. — 25 июля. — С. 10.

Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк

6 чэрвеня Семінар сельскіх бібліятэкараў раёна «Бібліятэкі за здаровы лад жыцця», на якім ішла размова аб індывідуальнай рабоце з чытачамі розных узростаў, наладжванні кантактаў з наведвальнікамі, прапагандзе здаровага ладу жыцця. Удзел у мерапрыемстве прыняў старшыня Мікалаёўскага сельвыканкама *В. П. Шастакоў (Мікалаёўская сельская бібліятэка).*

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

Літаратурна-музычная кампазіцыя «Мой беларускі, мой адзіны край, ад калыскі дарагі…» для выхаванцаў дзіцячага сада № 25, прысвечаная Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь *(дзіцячая бібліятэка-філіял № 7).*

2 ліпеня Літаратурны вечар «Пусть войны не будет никогда» *(дзіцячая бібліятэка-філіял № 1)*, «Радзіма, прымі маё шчырае слова» *(Мацюшэўская сельская бібліятэка)*, «А завецца Беларуссю непаўторны родны край…» *(Маласітнянская сельская бібліятэка).*

3 ліпеня Літаратурна-музычная кампазіцыя «И пусть поколения помнят» *(Гомельская сельская бібліятэка).*

6 ліпеня Фальклорнае свята «Хай зноў і зноў запальваецца купальскае вогнішча» *(Лесаўская сельская бібліятэка-клуб)*, «На Купала ночка мала» *(Азінская сельская бібліятэка).*

15 ліпеня Гадзіна творчага мыслення «У краіне Фантазіі» для наведвальнікаў школьнага лагера СШ № 16 *(бібліятэка-філіял № 8).*

18 ліпеня Вулічнае свята «Літаратурны салют Полацку!» *(цэнтральная бібліятэка імя Ф. Скарыны)*. Гасцям і жыхарам горада была прапанавана выстаўка-галерэя «Крэатыўныя кнігі», на якой былі прадстаўлены самыя незвычайныя кнігі з фондаў бібліятэк горада. Надзеўшы спецыяльныя акуляры, можна было апынуцца ў свеце 3D графікі. Сваёй яркасцю і арыгінальнасцю зачароўвалі музычныя і трохмерныя выданні, кнігі-цацкі. Прыцягвала ўвагу жыхароў

Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк

6 ліпеня Фальклорна-тэматычная вечарына «Купальскія забавы» *(сельская бібліятэка аграгарадка Сваташыцы)*.

6 ліпеня Фальклорная гульня «Плыви, плыви, веночек» (*сельская бібліятэка аграгарадка Станіславова)*, фальклорная гадзіна «Купальскія забавы» *(сельская бібліятэка аграгарадка Сіпішчава)*, тэатралізаванае прадстаўленне «Купальскія гісторыі» *(Дзяцельская сельская бібліятэка-клуб)*.

26 ліпеня Гульнёвая праграма «Ловись, рыбка» *(сельская бібліятэка аграгарадка Зарубы)*.

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

3 ліпеня У рамках святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь супрацоўнікамі раённай бібліятэкі былі падрыхтаваны і праведзены наступныя мерапрыемствы: краязнаўчая гульня-падарожжа «Книжные маршруты Лепельщины», апытанне «Интернет или книга?», выстаўка-панарама «Падарожжа па вуліцы Горкага».

Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк

3 ліпеня Супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі* прынялі ўдзел у святкаванні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У рамках праекта «Библиотека вне стен» усе жадаючыя маглі наведаць «Франтавую бібліятэку» і азнаёміцца з кніжнай выстаўкай «Эхо войны сердце тревожит», стаць удзельнікам акцый «Книга заговорила» і «Дерево памяти».

28 ліпеня Дзень праваслаўнай кнігі «Святая Белая Русь», прысвечаны 1025-годдзю Хрышчэння Русі, у рамках якога адбыўся агляд кніг з аднайменнай выстаўкі, гадзіна духоўнасці «Праваслаўныя святыні на Беларусі», знаёмства з кнігай К. Бястужава-Руміна «Крещение Руси» і прагляд фільма «Полоцк православный» *(дзіцячая бібліятэка)*.

31 ліпеня Віцебск наведала афіцыйная дэлегацыя горада Харбіна Кітайскай Народнай Рэспублікі. Адбылася сустрэча кітайскай дэлегацыі са старшынёй гарвыканкама В. Нікалайкіным. Госці ўсклалі кветкі да помніка воінам-вызваліцелям, партызанам і падпольшчыкам на плошчы Перамогі, наведалі музей-сядзібу «Здраўнёва», азнаёміліся з экспазіцыяй абласнога краязнаўчага музея. Творчыя калектывы і выканаўцы г. Віцебска атрымалі запрашэнне прыняць удзел у Міжнародным фестывалі «Харбинское лето», які адбудзецца ў 2014 годзе.

Витьбичи=Віцьбічы. — 2013. — 1 авг. — С. 1.

АГРАЭКАТУРЫЗМ

Прадстаўнікі Полацкага, Лепельскага, Глыбоцкага, Верхнядзвінскага і Міёрскага раёнаў **20 ліпеня** прынялі ўдзел у кулінарным фестывалі ў рамках праекта «LLB-2-226 BELLA CUISINE» трансгранічнай праграмы супрацоўніцтва трох каін – Беларусі, Літвы і Латвіі (у пяці кіламетрах ад г. Рэзекне). Мерапрыемства накіравана на захаванне мясцовых традыцый, прадзвіжэнне нацыянальнай кухні і гастранамічнага турызму ў Віцебскай вобласці і Латгальскім рэгіёне.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

Витьбичи=Віцьбічы. — 2013. — 1 авг. — С. VI.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

9–10 ліпеня ў Полацку прайшлі Дні яўрэйскай культуры, у якіх прынялі ўдзел больш за 150 прадстаўнікоў яўрэйскай абшчыны, жыхароў і гасцей. Пры падтрымцы адміністрацыі горада былі арганізаваны фотавыстаўка «Еврейское местечко», канцэрт клязмерскай музыкі пад адкрытым небам, экскурсія па Полацку, відэапрэзентацыя фільма пра

скрыпача-віртуоза Я. Хейфеца.

Полацкі веснік.— 2013. — 19 ліп. — С. 7.

20 ліпеня ў г. п. Лёзна адбылося **свята вуснай народнай творчасці і самабытнага гумару «З невычэрпнай кайстры Несцеркі»**, падрыхтаванае работнікамі раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра. У праграме: выступленне творчых калектываў раёна, чытанне вершаў, баек, гумарыстычнай прозы і інш. Са сваімі міні-прадстаўленнямі выступілі тэатры мініяцюр, у тым ліку РДК, ДК аграгарадка Крынкі, а таксама калектыў «Ідучыя на смех» з пасёлка Падсвілле Глыбоцкага раёна. Сваю ацэнку выступленням аматараў мастацкага слова дала і ганаровы госць свята, член журы, актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа Р. Грыбовіч.

Сцяг Перамогі (Лёзна). — 2013. — 26 ліп. — С. 3.

21 ліпеня ў в. Перабродцзе Міёрскага раёна адбылося **свята народнай творчасці «Перабродская зорка»**, у рамках якога прайшоў конкурс дзіцячых малюнкаў, а таксама праграма мастацкай самадзейнасці «Перабродскі маладзік» з удзелам творчых калектываў Паташнянскага СК і Перабродскага СДК.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

6 ліпеня на беразе Дняпра, які злучае два населеныя пункты – Копысь і Александрыю, прайшло традыцыйнае купальскае свята і **фестываль «Александрыя збірае сяброў»**. Госці мерапрыемства змаглі пабываць на «Александрыйскім кірмашы», дзе былі прадстаўлены вырабы народнай творчасці Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Аршанскі дом рамёстваў прадставіў свае керамічныя і ткацкія работы, вырабы з бісеру, лазы, сваю прадукцыю прапаноўваў Аршанскі льнокамбінат. Узорны ансамбль эстраднага танца «Ві-за-ві» з г. Оршы (кіраўнік *А. Васілеўская*) выступаў разам з салістамі нацыянальнага цэнтра імя У. Мулявіна.

Аршанская газета. — 2013. — 9 ліп. — С. 2.

На жывапісным беразе возера Шо Глыбоцкага раёна прайшло

«Кніга народнай славы», прысвечанага 70-годдзю вызвалення Гарадоцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў *(цэнтральная раённая бібліятэка).*

18 ліпеня Урок-падарожжа з героямі Я. Маўра «Праваднік жалечы – Янка Маўр» сумесна з віцебскім літаратурна-краязнаўчым клубам «Прадслава» *(Прудніцкая сельская бібліятэка).*

24 ліпеня Дзень краязнаўства «Край, где мы живем», прымеркаваны да 70-годдзя вызвалення пасёлка і раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў *(Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка).*

31 ліпеня Сустрэча бібліятэкараў аграгарадкоў у рамках міні-праекта «Прафесійныя сустрэчы-2013» *(Межанская сельская бібліятэка).* Прысутным была прадстаўлена электронная прэзентацыя бібліятэкі, альбом «Будни и праздники Меженской библиотеки», сцэнарый дзіцячага свята «Друзья именинника – желанные гости в нашем доме».

Глыбоцкая раённая сетка публічных бібліятэк

22 ліпеня Бібліятэчны калейдаскоп «О вишне румяной замолвите слово» *(цэнтральная раённая бібліятэка).*

Докшыцкая раённая сетка публічных бібліятэк

2 ліпеня Патрыятычная гадзіна «Дзень маёй краіны» *(Бягомльская гарпасялковая бібліятэка імя П. Панчанкі).*

3 ліпеня Супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі* прынялі ўдзел у святкаванні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і правялі мерапрыемства пад назвай «Кніжка вышла пагуляць». Жыхарам горада была прапанавана конкурсна-забаўляльная праграма, афармлена выстаўка кніг рознай тэматыкі.

Падчас летніх канікул у *цэнтральнай раённай бібліятэцы* дзейнічае акцыя «Лета кніжнае, будзь са мной!», вынікі якой будуць падведзены ў жніўні.

Родныя вытокі (Докшыцы). — 2013. — 20 ліп. — С. 4.

мая, пявучая» *(Пагашчанская сельская бібліятэка)* з удзелам работнікаў Пагашчанскага СДК.

Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк

2 ліпеня Тэматычны вечар «Беларусь мая, сінявокая» і разгорутая кніжная выстаўка «Квітней, родная Беларусь!», прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь *(Шапечынская сельская бібліятэка)*.

9 ліпеня Лялечны спектакль «Кот – рыбалоў» па казцы В. Суцеева (з нагоды 110-годдзя пісьменніка), пастаўлены ўдзельнікамі клуба «Кнігачэй» *(Тулаўская сельская бібліятэка)* для чытачоў малодшага школьнага ўзросту.

12 ліпеня Прэм'ера кнігі Л. Ціняковай «Дзівосы летняга лугу» (у рамках праекта «Школа захапляючага чытання») у летнім школьным лагеры гімназіі № 6 *(цэнтральная раённая бібліятэка)*.

16 ліпеня Краязнаўчая гадзіна «Прыдзвінскімі шляхамі», прысвечаная 25-годдзю музея-сядзібы І. Я. Рэпіна «Здраўнева». Чытачы азнаёміліся з кнігамі Д. Р. Газіна «По репинским местам Придвинья» і А. М. Падліпскага «Здравнево: здесь жил И. Е. Репин» *(Мазалаўская сельская бібліятэка)*.

23 ліпеня Арттэрапеўтычная майстэрня для дзяцей «Цуды цеста» запрасіла чытачоў на майстар-клас па рабоце з салёным цестам і знаёмства з кнігай В. А. Кастручына «Казкі старой чарапахі» *(Курынская сельская бібліятэка)*.

26 ліпеня Літаратурнае знаёмства з аповесцю Т. Д. Дземідовіч «Не плач, Лізанька» з цыкла «Часопіс "Маладосць" прапануе…» для моладзі і падлеткаў *(Шапечынская сельская бібліятэка)*.

Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк

3 ліпеня Выстаўка-экспазіцыя «Памятаем аб мінулым, ганарымся сучасным», падрыхтавана ў рамках раённага конкурсу аўтарскіх выставак «Аб вайне – у імя жыцця» і раённага праекта бібліятэк Гарадоцкага раёна

абласное свята абрадавага фальклору «Купалле Паазер'я». У ноч з **6** на **7 ліпеня** фальклорныя калектывы Віцебшчыны выконвалі старадаўнія песні, дэманстравалі свае здольнасці ў песеннай «баране» і святочных «разбрыках». Абрадавыя дзействы прайшлі ў гэтым годзе на тэрыторыі Пастаўскага, Міёрскага, Чашніцкага і іншых раёнаў. Падчас свята адбыўся агляд-конкурс відэафільмаў абрадавага фальклору Віцебшчыны «Купалле Паазер'я-2013».

Витебские вести. — 2013. — 13 ліп. — С. 6.

Філіял Літаратурнага музея імя Янкі Купалы, што знаходзіцца ў маляўнічым кутку Аршаншчыны на беразе Дняпра ў Ляўках, **6 ліпеня** запрасіў прыхільнікаў творчасці славутага песняра на **абласное свята паэзіі і музыкі «Купалаўскія зарніцы»**, прысвечанае 131-й гадавіне з дня нараджэння Івана Луцэвіча. Як заўсёды, Ляўкоўская зямля сустракала добра прызнаных беларускім чытачом паэтаў і пісьменнікаў, сярод якіх *Т. Краснова-Гусачэнка*, *Г. Пашкоў*, *В. Шырко*, *С. Антановіч*, *П. Саковіч*, *А. Жыгуноў*, *Б. Беляжэнка*, *І. Саверчанка*, *Сяргей* і *Галіна Трафімавы* і многія іншыя. Літаратары дэкламавалі вершы песняра і ўласныя творы, узгадвалі біяграфію Я. Купалы, расказвалі пра яго творчасць і г. д. Супрацоўнікі музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны пазнаёмілі гасцей са старадаўнімі абрадамі. На свяце былі прадстаўлены кніжныя выстаўкі: «Каб любіць Беларусь маю мілую…», «Прыйдзі, пясняр, да нас на Купалле…», «Застаецца слова ў сэрцы». «Ляўкоўскі кірмаш» прадставіў выстаўку работ народных майстроў. Удзельнікаў кірмашу чакала тэатралізаваная канцэртная праграма «У госці да Паўлінкі», падрыхтаваная народным тэатрам «Катарсіс» гарадскога Палаца культуры, выступленне Высокаўскага народнага хору, народнага ансамбля музыкі і песні г. Барані «Крынічанька», узорнага харэаграфічнага калектыву гарадскога Цэнтра культуры «Весялушкі», цыркавой студыя «Фантазёры» гарадскога Цэнтра культуры і студыі эстраднага танца «Шэп» гарадскога Палаца культуры.

Аршанская газета. — 2013. — 9 ліп. — С. 1, 3.

11 ліпеня адбылося ўрачыстае адкрыццё **XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску-2013»**. У яго рамках прайшло каля 60 мерапрыемстваў, у якіх удзельнічалі прадстаўнікі 31 краіны, пра іх расказвалі 500 прадстаўнікоў СМІ, а фестывальную акрэдытацыю атрымалі 5 тысяч чалавек.

У Летнім амфітэатры, які сёлета адзначыў 25-годдзе, быў пастаўлены рэкорд – упершыню за ўсю гісторыю існавання ў адзін фестывальны дзень яго гледачамі сталі 18000 чалавек. **13 ліпеня** на галоўнай сцэне прайшлі тры аншлагавых канцэрта. Па 6000 гледачоў сабралі італьянскія выканаўцы, начное выступленне групы «Руки вверх» з удзелам беларускай групы «Без билета» і канцэрт першага дня XXII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2013». Заслужаны артыст Расіі *Леанід Агуцін* адзначыў 45-годдзе на сцэне Летняга амфітэатра сумесным канцэртам з *Уладзімірам Прасняковым*, *Анжалікай Варум* і *Наталляй Падольскай*.

Народная артыстка СССР *Эдзіта П'еха* ўдастоена спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Через искусство – к миру и взаимопониманию». *Рая Маўсісян*, выканаўца з Расіі, узнагароджана прэміяй імя Уладзіміра Мулявіна за лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы і выканальніцкае майстэрства.

15 ліпеня былі падведзены вынікі XXII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2013». Гран-пры фестывалю атрымаў выканаўца з Польшчы *Міхал Качмарак*. Першае месца заваявала выканаўца з Харватыі *Сабрына*. Лаўрэатамі другой прэміі сталі *Яўген Андрыянаў* з Малдовы і *Арчыл* з Грузіі. На трэцім месцы – *Крысці* з Румыніі і прадстаўнік Беларусі *Аляксандр Салаўёў*.

На працягу трох дзён у КЗ «Віцебск» праходзіў XI Міжнародны музычны дзіцячы конкурс «Віцебск-2013». У выніку ўладальніцай Гран-пры стала *Прэсіяна Дзімітрава* з Балгарыі, першую прэмію прысудзілі *Ленцы* з Грузіі. Беларуска *Аляксандра Лакціёнава* і ўкраінец *Арсен Шаўлюк* атрымалі другую прэмію, трэцюю – *Даяна Кірылава* (Расія) і

і Айчыне», падчас якога прайшлі мультымедыйная прэзентацыя «Спеў аб Еўфрасінні», прагляд і абмеркаванне стужкі *А. Лукашэвіча* «Эпоха Еўфрасінні», гутарка «Святая апякунка Баларусі» і інш. *(бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай)*.

5 ліпеня Сустрэча «Казачнік зялёнага царства» навучэнцаў гімназіі № 4 з *Н. Ільіной*, дачкой пісьменніка *Р. Шакулава*. На мерапрыемстве была прэзентавана кніга аўтара «Сказки зелёного царства» *(бібліятэка імя Е. Лось)*.

Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

1 ліпеня Акцыя «Цветы ветерану» да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, мерапрыемства падрыхтавана сумесна з валанцёрамі БРСМ *(бібліятэка імя У. Караткевіча)*.

18 ліпеня Відэагадзіна, прысвечаная 120-годдзю рускага паэта У. Маякоўскага, з удзелам членаў гарадскога клуба сталых людзей «Еще не вечер» *(бібліятэка імя У. Маякоўскага)*.

24 ліпеня Адкрыццё выстаўкі работ удзельнікаў клуба лапікавага шыцця «Рошва» (г. Полацк) «Искусство из лоскутка и любви» *(бібліятэка імя У. Маякоўскага*).

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

2 ліпеня Урок палітычнай культуры «Беларусь – краіна маёй будучыні» для дзяцей Браслаўскага абласнога падлеткавага туберкулёзнага рэабілітацыйнага цэнтра *(Браслаўская дзіцячая бібліятэка)*.

2 ліпеня Літаратурна-музычная кампазіцыя «Суровым быў славуты шлях» *(Далёкаўская сельская бібліятэка)*, віртуальнае падарожжа «Не знойдзеш ты на ўсёй зямлі мілейшага за гэты край» *(Богінская сельская бібліятэка)*, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

28 ліпеня Сустрэча з музыкантам *Раманам Гембіцкім* «Гармонь

Глыбоцкай дзіцячай мастацкай школы імя Язэпа Драздовіча, а таксама здымкі мясцовых фатографаў на вішнёвую тэматыку, адбыліся выступленні творчых калектываў УП «Віцебскаблгаз» і Падсвільскага гарпасялковага Дома культуры, прайшло гашэнне маркі спецыяльным штэмпелем ў выглядзе вішань, дэманстрацыя фільма «Вішнёвая мяцеліца» глыбоцкага рэжысёра *У. Барылы* і шмат іншых мерапрыемстваў. Фэст стане традыцыйным. У наступным годзе яго плануецца сумясціць са святкаваннем 600-годдзя Глыбокага.

http://news.tut.by/kaleidoscope/359337.html

З **31 ліпеня** па **4 жніўня** на базе праваслаўнага маладзёжнага лагера «Дружба» (каля вёскі Вароны) праходзіў традыцыйны маладзёжы фестываль «Адзігітрыя-2013», у яім прынялі ўдзел каля 300 маладых людзей з Беларусі, Украіны і Расіі. **1** і **3 жніўня** ўдзельнікі форуму далі канцэрт ля сцен Успенскага сабора і ў Летнім амфітэатры. Таксама ў праграме мерапрыемства інтэрактыўныя гульні, майстар-класы па харэаграфіі, вогненнае шоу і інш. Па завяршэнні творчай часткі фестывалю з **5** па **10 жніўня** адбудзецца крэсны ход ў Смаленск у гонар іконы Божай Маці «Адзігітрыя».

Витебский проспект. — 2013. — 25 июля. — С. 2.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

18 ліпеня адбылася прэзентацыя зборніка вершаў Д. Сімановіча «Чего там на жизнь обижаться».

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

2 ліпеня Урок-роздум да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь «Найлепшая ў свеце краіна» *(бібліятэка імя М. Багдановіча).*

5 ліпеня Літаратурна-музычная вечарына «Скарбонка Купалаўскай спадчыны» *(бібліятэка імя Я. Купалы).*

4–7 ліпеня Тыдзень памяці Еўфрасінні Полацкай «Служэнне Богу

Галіна Дубок (Украіна).

Удзельнікамі свята сталі *Надзея Бабкіна*, *Аляксандр Малінін*, *Анатоль Ярмоленка*, *Анжаліка Агурбаш*, *Дзіма Білан*, *Крысціна Арбакайтэ*, *Іна Афанасьева*, *Алёна Ланская* і іншыя артысты.

Апошнім канцэртам фестывалю была «Рок-панарама», якая падарыла гледачам сустрэчу з *Сяргеем Мазаевым* і групай «Маральны кодэкс», *Вольгай Кармухінай*, *Максімам Пакроўскім* і групай «Ногу свело».

Падчас **кірмашу народных рамёстваў і мастацтваў «Задзвінскі кірмаш»** у культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо Віцебска “Дзвіна”» адбылася выстаўка работ асацыяцыі майстроў лапікавага шыцця Расіі «Душа России» і выстаўка вырабаў майстроў лапікавага шыцця Беларусі (г. Мінск, г. Гродна і г. Полацк) (**10** і **11 ліпеня**), адкрыты конкурс па мастацкай апрацоўцы дрэва (з **10** па **14 ліпеня**), шоу-праграма фальклорнага цэнтра «Красный сарафан», «Русский квадрат» (Якуція), майстар-класы і выстаўка кузнечнага рамяства «Чаўначок», свята беларускіх ганчароў «Чароўная гліна» (з **12** па **14 ліпеня**) і міжнародны фестываль дзіцячай і маладзёжнай творчасці «Радуга над Витебском» (з **15** па **17 ліпеня**). Адбыліся паказальныя выступленні клубаў гістарычнай рэканструкцыі і мадэліравання «Нагльфар», «Хальвіль», «Паўночная вежа», а таксама канцэрт лаўрэатаў і дыпламантаў Міжнароднага фестывалю творчасці інвалідаў «Віцебск-2013».

Каля пяцісот майстроў дамоў рамёстваў Віцебшчыны і іншых абласцей краіны, а таксама Расіі, Украіны, Літвы і Латвіі прынялі ўдзел у «Горадзе майстроў». У рамках выстаўкі-кірмашу прайшлі выстаўкі-класы, а **13–14 ліпеня – адкрыты абласны конкурс традыцыйнага ткацтва «Палатняныя пераплёты»**. Праект прыцягнуў да ўдзелу каля сарака майстроў з розных куткоў Беларусі, Расіі (Ленінградскай вобласць, г. Курск, г. Пскоў, г. Смаленск), Украіны (г. Чарнігаў), Літвы і Латвіі. Лепшай ткачыхай прызнана 77-гадовая жыхарка в. Дарапеевічы *С. Сцепанюк* (Брэсцкая вобласць). У ткацтве ручнікоў лепшай стала

А. Камека з Лепельскага раённага Дома рамёстваў. У ткацтве посцілак першае месца аддалі *Г. Рымдзёнак* з г. п. Шаркаўшчына. Лепшымі палавікамі названы вырабы прадстаўніцы Мінскай вобласці *І. Яскевіч*. У ткацтве паясоў не было роўных члену Беларускага саюза майстроў народнай творчасці *Н. Канановіч*. *А. Вуціна* з Латвіі атрымала узнагароду за выкарыстанне рэдкай тэхнікі.

Витебский проспект. — 2013. — 18 июля. — С. 5.

Витебские вести. — 2013. — 20 июля. — С. 9.

У Музычнай гасцёўні падчас фестывалю адкрылася выстаўка «Партнерство традиций и моды», на якой была прадстаўлена калекцыя паўлапасадскіх шаляў і мадэляў адзення, створаных на аснове традыцый народнага славянскага касцюма. Экспазіцыя – вынік творчай работы аўтарскага калектыву мастакоў ААТ «Павлопосадская платочная мануфактура» і ДУ культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо Віцебска “Дзвіна”».

Витебские вести. — 2013. — 13 июля. — С. 1, 8—9.

12–13 ліпеня – Дні моладзі на фестывалі, падчас якіх прайшла акцыя «Мы помним и гордимся», бітва дзіджэяў, фестываль «Огонь танца», парад маладзёжных субкультур, вечарына ў стылі рэп і інш.

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Р. Рапота **12 ліпеня** перадаў у дар музею-сядзібе І. Рэпіна «Здраўнёва» 14 унікальных копій карцін мастака. Мерапрыемства адбылося ў Дзень Саюзнай дзяржавы на XXII Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Витьбичи=Віцьбічы. — 2013. — 16 июля. — С. 4.

Па ініцыятыве Віцебскага аблвыканкама ў Віцебску адкрылі помнік *Уладзіміру Грыгор’еву* – аднаму з заснавальнікаў «Славянскага базару».

Витебские вести. — 2013. — 16 июля. — С. 1.

У рамках «Тэатральных сустрэч-2013» адбыўся монаспектакль вядучага артыста маскоўскага тэатра «Сатырыкон» *М. Аверына* «Все начинается с любви…». Акцёры «Московского театра на Юго-Западе»

прапанавалі спектакль па п’есе У. Шэкспіра «Укрощение строптивой», а таксама пастаноўку «Фотоаппараты» па п’есе П. Гладзіліна. Абодва спектаклі паставіў заснавальнік тэатра народны артыст Расіі рэжысёр *В. Беляковіч*. «Современный театр антрепризы» прадставіў на суд гледачоў спектаклі «Наши друзья человеки» Б. Вербера і «Двое на качелях» У. Гібсана (рэжысёр *А. Кірушчанка*).

«Фестывальная кінапраграма» гэтага года ўключала чатыры карціны: «Легенда № 17», «Мужская женская игра», «Дочь» (Расія) і фільм «Следы апостолов» (Беларусь) сумеснай вытворчасці УП «Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм”», ТАА «ПершаяКінаВідэаКампанія» і ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал».

http://news.tut.by/culture/355872.html

13 ліпеня ў абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстаўка работ мастакоў з латвійскага горада-пабраціма Даўгаўпілса (Латвія). На выстаўцы з назвай «SILVER» прадстаўлены лепшыя творы, створаныя ўдзельнікамі пленэраў імя Маркуса Ратковіча (Марк Ротка) 2005–2012 гадоў з Вялікабрытаніі, Польшчы, Латвіі, Літвы, Украіны, Даніі, ЗША, Італіі і Арменіі. У гэтай садружнасці і мастакі з Віцебска *Віктар Нікалаеў* і *Аляксей Літвін*.

Витьбичи=Віцьбічы. — 2013. — 25 июля. — С. V.

14 ліпеня ў краязнаўчым музеі г. Віцебска адбылася прэзентацыя выстаўкі графічных мініяцюр «Даугавпилс – большой… маленький». У эскпазіцыі прадстаўлены работы 18 мастакоў – удзельнікаў І Латгальскага сімпозіума графікі-2012.

Першы ў Беларусі **«Вішнёвы фестываль»** праходзіў з **21** па **27 ліпеня** ў г. Глыбокае. На свята прыехалі госці з Германіі, Арменіі, Польшчы, Ізраіля, Нідэрландаў і іншых краін. За час правядзення фестывалю вішня паспела стаць брэндам горада: тут адкрыўся помнік «Вішанька» (скульптар *І. Казак*), закладзены вялікі вішнёвы сад з 1414 саджанцаў, у хуткім часе з'явіцца Вішнёвая вуліца. На вернісажы «Вішнёвая мяцеліца» была прадстаўлена выстаўка работ юных мастакоў